## З гісторыі майго роду (вайна ў маёй сям'і)

*Шывілька Марыя*, студэнтка групы 11102117, АФ
Кіраўнік ст. выкладчык *А.М. Дайняк*

*Не страшна жыць*
*Я – дрэва з каранямі:*
*Радзіму маю, продкаў і сям'ю.*
*Цаню ўсё, бо вельмі добра знаю*
*Сама ў чыйсьці корань я пайду.*

Дзесьці я прачытала, што дрэва тады моцнае, калі ў яго моцныя вялікія карані. Мае карані – гэта мае продкі. Не было сярод іх людзей з гучнымі імёнамі, не пісалі пра іх у газетах і часопісах, не паказвалі іх па тэлевізары. Але для мяне яны – сапраўдны гонар і прыклад. Ні ў кога з іх не было жыццё лёгкім і гладкім. Усе мае продкі былі выхадцы з сельскай мясцовасці. Нягледзячы на тое, што ўсе яны жылі ў розны час і былі рознымі па характарах, усіх іх аб'ядноўвала тое, што гэта былі вельмі працавітыя і сумленныя людзі.

Свайго дзеда, мамінага тату, я ніколі не бачыла. Ён памёр за год да майго нараджэння. Але мая маці і мая бабуля шмат мне пра яго расказвалі. Можна сказаць, што я ведаю ўсё яго жыццё. Звалі яго Мікалай Сямёнавіч, ён нарадзіўся ў пачатку вайны і ўсё яго дзяцінства праходзіла ў пасляваенныя цяжкія гады. Мой дзед скончыў толькі 7 класаў, але ад прыроды ён быў вельмі таленавітым чалавекам. У пачатковай школе Мікалай з сябрамі аднакласнікамі замест урокаў хадзілі ў "партызаны". Яны ішлі ў лясок побач з вёскай, дзе зрабілі сабе шалаш, палілі там невялікае вогнішча, пяклі бульбу і сала. Відавочна, для хлопцаў гэта было цікавейшай справай у параўнанні з школьнымі заняткамі.

Усё сваё жыццё дзед працаваў шафёрам у калгасе і вельмі добра разбіраўся ў тэхніцы. Па характары дзед быў жартаўніком. Але сваім трапным жартам і гумарам ён ніколі нікога не пакрыўдзіў. Мой дзед вельмі нагадвае мне жартаўніка і веселуна дзядьку Антося з паэмы Я. Коласа "Новая зямля". Дзед ездзіў на малакавозе і збіраў малако з вёсак і малочнай фермы. Летам у 4 гадзіны раніцы ён быў ужо ў дарозе. Мне нават цяжка ўявіць, што ён працаваў без выхад-

ных. Хачу дадаць, што дзед вельмі добра ведаў гісторыю, цікавіўся палітыкай, выпісваў і чытаў шмат газет і часопісаў.

Мне вельмі сумна, што я не застала свайго дзеда ў жывых. Але я заўсёды радуюся, калі кажуць, што я тыя ці іншыя рысы характару і знешнасці атрымала ў спадчыну менавіта ад яго.

На шчасце, жыве мая бабуля, Ніна Міхайлаўна, якую я вельмі люблю. Яна для мяне таксама прыклад. Бабуля кажа, што сваю працу і сваю прафесію трэба любіць і тады яна будзе табе лёгкай і зразумелай. А сваю працу бабуля любіла і вельмі добра ведала, таму што пачынала яе з самых нізоў. Працавала бабуля галоўным бухгалтарам у калгасе. Праца была адказная, трэба было ведаць і жывёлагадоўлю, і раслінаводства, і транспарт, і будаўніцтва. На яе прафесійным шляху нярэдка сустракаліся несумленныя людзі і сапраўдныя махляры, бо праца была звязана з грошамі. Але бабуля, выхаваная ў веруючай і сумленнай сям'і, ніколі не паддавалася на спакусы і не клала ў сваю кішэню калгасныя грошы. Таму яна і не назапасіла сабе матэрыяльнага багацця. Зараз яна жыве ў сціплай вясковай хаце.

Добра ведаю я і жыццё бабулі і дзядулі сваёй маці па яе расказах. Мой прадзед Міхал вярнуўся з вайны цяжка паранены. Ён атрымаў кантузію і кульгаў. Нягледзячы на тое, што ўсё астатняе жыццё у яго вельмі балела галава, ён быў у працы з ранку да вечару. Дзед працаваў вартаўніком на малочнай ферме ў суседняй вёсцы, а калі не змог больш хадзіць на працу, працягваў працаваць у сваёй гаспадарцы: касіў, насіў сена на спіне ў дзяружцы, садзіў з дапамогай рыдлёўкі бульбу. Калі мой прадзед памёр, адна мясцовая жанчына сказала, што гэты чалавек ніколі ні з кім не пасварыўся. І гэта сапраўды так.

Другі мой прадзед таксама быў на вайне. Я не вельмі добра ведаю яго жыццё, але бачыла на фотаздымку, што ў яго шмат ваенных медалёў. А гэта таксама пра многае гаворыць.

Бабуля маёй маці, Маруся, не мела магчымасці хадзіць у школу. Яна не ўмела ні пісаць, ні чытаць. Але была вельмі мудрай, сціплай і таксама працавітай жанчынай. У яе руках ішла спарней любая праца. Я вельмі шаную памяць сваіх продкаў і даглядаю іх магілкі. Як я магу не любіць іх, калі менавіта яны, як і іншыя людзі іх пакалення, далі мне магчымасць жыць, не ведаючы вайны, і вучыцца.